Весці БДПУ. Серыя 2. 2021. № 4. С. 101–106

УДК [069+008]:726(476)
музеязнаўства (культуралогія)

# АКТУАЛІЗАЦЫЯ СТАРАЖЫТНЫХ ПОМНІКАЎ ГРОДНА Ў 1945–1951 гг.: МАРФАЛОГІЯ, МЕТАДЫ І ПРЫНЦЫПЫ МУЗЕЕФІКАЦЫІ

**Н. А. Пачобут,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра*
*даследаванняў беларускай культуры,*
*мовы і літаратуры НАН Беларусі*

Паступіў у рэдакцыю 08.10.21.

UDC [069+008]:726(476)
музеязнаўства (культуралогія)

# ACTUALIZATION OF ANCIENT MONUMENTS OF GRODNO IN 1945–1951: MORPHOLOGY, METHODS AN PRINCIPLES OF MUSEUMIFICATION

**N. Pochobut,**
*PhD in History, Senior Researcher*
*Center of Studying the Belarusian Culture,*
*Language and Literature, National*
*Academy of Sciences of Belarus*

Received on 08.10.21.

Аўтар артыкула паказвае, як у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў Беларускай ССР пачала распрацоўвацца стратэгія актуалізацыі ў музейнай прасторы помнікаў археалогіі шляхам музеефікацыі, у выніку чаго даследчыкі-археолагі і музейныя супрацоўнікі ўпершыню ў рэспубліцы сумесна выпрацавалі шэраг метадаў і прынцыпаў. У артыкуле названы складнікі пераўтварэння аб’ектаў раскопак у аб’екты музейнага значэння і культурныя збыткі (марфалогія музеефікацыі), да якіх аўтар адносіць: ідэнтыфікацыю помніка з фармулёўкай ідэі захавання і выкарыстання; навуковыя даследаванні і вызначэнне каштоўнасці помніка; кансервацыю, рэстаўрацыю і ахову; прэзентацыю.

*Ключавыя словы:* музей, музеефікацыя аб’ектаў археалогіі, марфалогія музеефікацыі.

The author of the article shows how the strategies of museum actualization of archeological monuments by means of museumification started to be worked out in the first postwar decade in Belarusian SSR; as a result researchers-archaeologists and museum workers together have worked out a range of methods and principles for the first time in the republic. The article names the constituents of transforming the objects of excavations into the objects of museum sense and cultural findings (morphology of museumification); they are the following: identification of the monument with the formulated idea of preservation and usage; scientific research and defining the value of the monument; conservation, restoration and protection; presentation.

*Keywords:* museum, museumification of archeological objects, morphology of museumification.

*Уводзіны.* Пад актуалізацыяй гісторыка-культурнай спадчыны навукоўцы разумеюць дзейнасць, накіраваную на захаванне і ўключэнне ў сучасную культуру матэрыяльных аб’ектаў. Згодна вызначэнню паняцця «актуалізацыя» ў слоўніку музейных тэрмінаў, гэта адбываецца шляхам актывізацыі іх сацыякультурнай ролі і інтэрпрэтацыі[1]. У дачыненні да археалагічнай спадчыны ў якасці прыярытэтнага, а вельмі часта – адзінага магчымага способу актуалізацыі з’яўляецца музеефікацыя. Да 1988 г. у музейнай сетцы рэспублікі працаваў адзін гісторыка-археалагічны музей у Гродне (ГДГАМ), у наш час музеяў сістэмы Міністэрства культуры такой спецыялізацыі налічваецца два – Гродна і Мсціслаўль, ёсць некалькі філіялаў музеяў у Брэсце, Тураве, Мінску, Моталі, Юравічах. Як паказвае айчыннае і расійскае музеязнаўства, тэарытычныя распрацоўкі і метадычныя рэкамендацыі па праблемах вельмі папулярнай ва ўсім свеце музеефікацыі помнікаў археалогіі можна рабіць толькі на аснове аналізу музейнай дзейнасці, назапашанага станоўчага і адмоўнага вопыту захавання археалагічнай спадчыны. Сведкай таму працы вядомых расійскіх культуролагаў і археолагаў М. М. Булатава, О. М. Бадэра, Л. А. Беляева, М. Д. Нядовіча, Ю. А. Вядзеніна, І. К. Бахцінай, А. І. Мартынава, А. М. Мядзведзя, А. М. Дробышава, С. Ю. Камянецкага. На прыкладзе ГДГАМ нам прадстаўляецца магчымым прасачыць складнікі музеефікацыі помнікаў, якую мы разгледзім як напрамак музейнай дзейнасці, звязаны з профільнай навукай (археалогіяй). Прапануецца даследаванне марфалогіі музеефікацыі, пры гэтым звяртаецца ўвага на выпрацоўку прынцыпаў і метадаў музеефікацыі ў пасляваенны перыяд. Такі падыход да аналізу праблемы раней не выкарыстоўваўся.

[1] Актуализация наследия // Словарь музейных терминов. Российская музейная энциклопедия [Электронный ресурс] // http://www.museum.ru/rme/dictionary.asp?41. – Дата доступа: 02.07.21.

Крыніцамі па тэме даследавання з’яўляюцца дакументы ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці, у фондах і архіве ГДГАМ.

*Асноўная частка.* Гродзенскі абласны гістарычны музей быў ператвораны ў Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей пастановай СНК БССР № 1121 ад 2 жніўня 1945 г. [1, л. 23]. Перайменаванне музея было звязана з ідэяй завяршэння даследаванняў і захавання цэласнага комплексу помнікаў археалогіі побач з будынкамі Старога замка, у якіх размяшчаўся музей. Змяненне профілю давала ўстанове магчымасць прадпрымаць дзейсныя захады па забеспячэнні належнага ўтрымання і вывучэння адкрытых да вайны рэштак манументальных культавых і грамадскіх пабудоў XII–XIV стст. на замку. Захавалася дакладная запіска першага пасляваеннага дырэктара музея Івана Ігнацьевіча Васілевіча, накіраваная 11 жніўня 1945 г. старшыні Камітэта па справах культурна-асветных устаноў пры СНК БССР. У ёй кіраўнік музея прывёў аргументы на карысць стварэння ў Гродне «Дзяржаўнага музея 1-га разраду СССР». Дырэктар пісаў, што «самым галоўным экспанатам музея з’яўляюцца раскопкі», якія даюць яскравае ўяўленне аб развіцці горада ў XII–XIII стст. Ён прасіў дапамагчы музею стварыць неабходныя матэрыяльную і навуковую базы і падтрымаць яго хадайніцтва па дадзеным пытанні перад урадам Беларускай ССР. Меркавалася, што плошча будучага «падземнага музея» на месцы раскопак даваеннага часу можа скласці 2506 м² [2].

У тым жа годзе ў Гродзенскім музеі распачалі вельмі важную справу, каб захаваць наяўныя каштоўныя археалагічныя калекцыі. Большасць з іх была атрымана ў выніку раскопак стваральніка музея Ю. Ядкоўскага і археолага З. Дурчэўскага ў 1932–1938 гг. Навуковая інвентарызацыя калекцый была арганізавана кіраўніком музея ў першы год пасля вызвалення горада. У Гродна прыехалі з Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР археолагі У. І. Галубовіч і А. А. Цэгак-Галубовіч. Да іх далучылі двух супрацоўнікаў фондаў і была створана рабочая група. Галубовічаў залічылі ў штат музея ў якасці старэйшых навуковых супрацоўнікаў [3, л. 33], і за перыяд з 1 лістапада 1945 г. да 15 красавіка 1946 г. імі было пераўлічана амаль 11 000 прадметаў. Гэта была не проста інвентарызацыя – фактычна была праведзена праца па выратаванні і новай пашпартызацыі даваенных матэрыялаў з раскопак летапіснага Гродна. Музейнай групе ўдалося аднавіць пашпарты прыкладна на 70 % знаходак. Інвентарызацыю масавага керамічнага матэрыялу затым працягвала рабіць Ф. Д. Гурэвіч, супрацоўнік Ленінградскага аддзялення Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры АН СССР (ЛО ІГМК). Галубовічы за непрацяглы час працы ў ГДГАМ падрыхтавалі да друку машынапісны тэкст «Новыя матэрыялы па гісторыі Гродна ў раннефеадальную эпоху». Абагульняючае даследаванне не было апублікавана ў сувязі з выездам аўтараў на пастаяннае месца жыхарства ў ПНР, але тэкст застаўся ў музеі. Ім карыстаўся таксама доктар гістарычных навук М. М. Варонін для напісання манаграфіі «Старажытны Гродна» (1949) [4]. Гэта кніга стала на дзесяцігоддзі ўзорам для савецкіх даследчыкаў-археолагаў, якія пісалі гісторыю старажытнарускіх гарадоў. Апрацоўка калекцый з раскопак спрыяла навуковай ідэнтыфікацыі розначасовых помнікаў археалогіі на гродзенскім дзяцінцы, якія яшчэ трэба было вывучыць. Упершыню ў кантэксце старажытнарускай культуры была абаснавана ўнікальнасць Ніжняй царквы і абарончых збудаванняў XII ст., прадстаўляючых арыгінальную Гродзенскую архітэктурную школу. Падкрэсліваліся добрая захаванасць культурнага пласта і асобных аб’ектаў на дзяцінцы ў параўнанні з вядомымі на той час у Савецкім Саюзе помнікамі.

У сувязі з вышэй сказаным, для рэгламентацыі працы музея спецыяльна быў распрацаваны дакумент – «Палажэнне аб Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі» ад 15 студзеня 1946 г. Згодна яму на ўстанову былі ўскладзены вельмі адказныя задачы па ахове ад пашкоджання, належным захоўванні і забеспячэнні правядзення навуковых даследаванняў помнікаў на Замкавай гары ў Гродне. Музей павінен быў займацца ўлікам помнікаў археалогіі на тэрыторыі ўсёй Гродзенскай вобласці і правядзеннем па меры неабходнасці раскопак [5]. Такім чынам, музей атрымаў статус не проста культурна-асветніцкай установы, але і навуковай установы. Менавіта з таго часу ўсе айчынныя музейшчыкі з адпаведнай адукацыяй называюцца згодна штатнага раскладу навуковымі супрацоўнікамі.

У сілу спецыфікі вырашаемых задач Гродзенскі музей першаснае значэнне надаваў навуковаму супрацоўніцтву, ад якога залежалі апрацоўка існуючых і атрыманне новых калекцый, а таксама стварэнне экс-

пазіцый. Камплектаванню калекцый у музеях у тыя часы надавалася вялікая ўвага кіруючых органаў. Музей у пасляваенны час меў цеснае супрацоўніцтва з навукова-даследчымі саюзнымі інстытутамі – з ІГМК АН СССР у Маскве і яго аддзяленнем у Ленінградзе. Экспедыцыі гэтых інстытутаў вельмі актыўна і плённа працавалі ў Беларусі ў 1949–1960-я гг., рэалізуючы праграмы даследавання сваіх устаноў. У 1947 г. музей абгрунтаваў перад урадам рэспублікі неабходнасць завяршыць раскопкі на замку. У Гродна дырэкцыяй музея былі запрошаны археолагі ЛО ІГМК АН СССР Ф. Д. Гурэвіч, якая займалася праблематыкай старажытнарускіх гарадоў, і П. А. Рапапорт, знаўца архітэктуры гэтага перыяду. Яны згадзіліся прыехаць у музей, каб азнаёміцца з помнікамі, назапашанымі калекцыямі і дамовіцца аб раскопках на наступны 1948 г. Але даследаванні былі праведзены толькі ў 1949 г. Музей змог атрымаць дзяржаўныя сродкі ў памеры 130 000 рублёў. Кіраўніцтва ўзялі на сябе не ленінградскія, а маскоўскія археолагі. П. А. Рапапорт усё ж такі прыязджаў у музей знаёміцца з помнікамі. Гісторык Л. В. Аляксееў, а ў 1949 г. – супрацоўнік гродзенскага музея, успамінаў як гэта было. Павел Аляксандравіч быў апрануты ў мундзір марскога афіцэра з корцікам. Складанасць музеефікацыі заключаецца ў тым, што заўжды патрабуюцца высілкі з боку музея. Навуковая музеефікацыя на этапе арганізацыі і правядзення даследаванняў можа пайсці хуткімі тэмпамі, а можа ператварыцца ў перапіску з інстанцыямі на працягу многіх гадоў і скончыцца безвынікова. Шчырая зацікаўленасць музея ў атрыманні рэзультату, выбар даследчыкаў, падыходаў і метадаў захавання помнікаў у значнай ступені залежалі ад кіраўніцтва музеяў. У канцы 1940-х гг. гэты кірунак музейнай дзейнасці толькі нараджаўся.

ГДГАМ удалося арганізаваць сумесную з Акадэміяй навук СССР Гродзенскую экспедыцыю пад кіраўніцтвам загадчыка сектара старажытнай Русі ІГМК АН СССР М. М. Вароніна (1904–1976), спецыяліста па архітэктуры перыяду Кіеўскай Русі, археолага, гісторыка мастацтва. М. М. Варонін адзначыў у сваёй справаздачы вялікую арганізацыйную працу, якая была ажыццёўлена дырэктарам музея М. І. Собалем і яго намеснікам М. І. Марцьянавым па падрыхтоўцы раскопак і ў ходзе іх правядзення [6]. М. І. Собаль стаў дырэктарам музея ў 1948 г., перад гэтым ён працаваў у Белдзяржмузеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску.

Гродзенская экспедыцыя працавала два месяцы – з 31 жніўня па 28 кастрычніка 1949 г. У яе складзе былі маладыя навуковыя супрацоўнікі, якія потым сталі выдатнымі расійскімі археолагамі: В. Л. Янін (1929–2020), будучы акадэмік, В. В. Сядоў (1924–2004), будучы член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук. Намеснікам начальніка быў А. В. Нікіцін (1914–1987), археолаг, які з 1938 г. удзельнічаў у раскопках Ноўгарада Вялікага пад кіраўніцтвам А. У. Арціхоўскага. Увайшлі ў склад экспедыцыі архітэктар В. К. Буч, рэстаўратар Л. Б. Арцішэўская, чарцёжнік Ю. В. Панкоў, фатограф В. П. Косцін, тэхнік-будаўнік Ф. С. Новікаў. Паралельна з раскопкамі на працягу 1949 г. у музеі працягвалася інвентарызацыя найбольш масавых калекцый. В. Л. Яніным была скончана апрацоўка керамічнага матэрыялу, В. В. Сядовым і Л. Б. Арцішэўскай падрыхтаваны да вызначэння касцяны і керамічны матэрыял з фондаў ГДГАМ. У ходзе работы ім удалося знайсці гравіраваную пазалочаную пласціну XII ст. ад аздаблення алтарнай перагародкі Ніжняй царквы з выявай св. Сымона, якая лічылася страчанай. Супрацоўнікамі экспедыцыі сумесна з работнікамі музея было апрацавана 115 скрынь з касцяным матэрыялам, керамікай, скурай 1930-х гг. З велізарнай колькасці артэфактаў вылучаны пашпартызаваныя, якія затым у адпаведнасці з шыфрамі польскіх археолагаў размяркоўваліся па раскопачных стратыграфічных ярусах і квадратах. Тым самым музейныя прадметы захавалі стратыграфічныя прывязкі і да сённяшнега часу з’яўляюцца каштоўнымі археалагічнымі крыніцамі [7, л. 1; 8, л. 1]. Шэраг супрацоўнікаў ГДГАМ (В. Г. Вульф, К. Ф. Кармішына, А. В. Рцішчава, Е. В. Мяснікова) пастаянна прыцягваліся да працы экспедыцыі [6]. Малады супрацоўнік музея, будучы знакаміты расійскі гісторык і археолаг Л. В. Аляксееў пачаў свой шлях у навуку менавіта з гэтай экспедыцыі. Пасля раскопак у Гродна ён і некаторыя іншыя гродзенскія музейшчыкі былі запрошаны да ўдзелу ў раскопках Інстытута гісторыі АН БССР на Мінскім замчышчы. Можна казаць, што даследаванні сталі справай музея. Раскопкі 1949 г. праводзіліся адпаведна тром участкам: Паўднёваму раскопу, Паўночнаму раскопу і Ніжняй царкве XII ст. Аб’ём храма з захаду быў адкрыты яшчэ ў 1930-я гг., але тры апсіды царквы яшчэ заставаліся пад

напластаваннямі. Для поўнага раскрыцця гэтага цэнтральнага помніка даследаванняў спачатку спатрэбілася разабраць фундаменты і сцяну з XIV ст., бо яны перакрывалі паўночную апсіду храма. Стан алтарнай апсіды быў «цалкам катастрафічны», паколькі доўгі час каля яе сцен стаялі глебавыя воды. М. М. Варонін пісаў, што «цагляная кладка амаль поўнасцю раскалолася, жыжа перагною працінае швы і ўжо ператварыла вонкавыя рады муроўкі ў брудную густую кашу, а буйныя дэкаратыўныя валуны нахіліліся вонкі» [6, с. 60, 69].

Таму адначасова з раскопкамі па асобным дагаворы з музеем неадкладную кансервацыю праводзіла брыгада Рэспубліканскіх навукова-вытворчых майстэрняў РСФСР па кансервацыі і рэстаўрацыі архітэктурных помнікаў [9]. Яе кіраўніком быў вядомы архітэктар-рэстаўратар І. В. Трафімаваў. Напярэдадні прац у Гродне, у 1937–1948 гг., І. В. Трафімаву ўдалося аднавіць ансамбль XV–XVIII стст. Троіца-Сергіевай лаўры ў Загорску. Гродна пашанцавала з калектывам спецыялістаў. Стан раней адкрытых на глыбіні 6–10 м ад дзённай паверхні аб'ёмаў Ніжняй царквы быў крайне складаным. Частка помніка стаяла дзесяць гадоў пад лёгкім навесам. Аголены раскопкамі 1938–1939 гг. фундамент паўднёва-заходняга вугла царквы значна разбурыўся ўжо ў 1947 г. і «выцякаў» з-пад сцяны. Арыгінальны фундамент быў складзены без звязваючага раствору з дробнага каменю, перасыпанага пяском. З-за нетрывалага фундаменту ўзнікла пагроза падзення вугла храма. Таму ў 1949 г. гэты ўчастак падмурка быў выбраны з-пад сцяны і нанова перакладзены на растворы. Паралельна сцяне царквы выклалі падпорную сценку. Пад размешчаны побач фрагмент заходняй вежы гродзенскай крэпасці на мысе Замкавай гары падвялі армiраванае аснаванне, затым зрабілі падпорныя ўмацаванні. Гэта вежа была змураваная ў XII ст. без фундамента. Адкрытая ў 1930-я гг., яна ў 1949 г. мела ўжо пагрозлівыя для захавання трэшчыны. Сцяну XVII ст., якая абмяжоўвала тэрыторыю раскопа з поўдня, падтрымалі цагляным контрфорсам [6, с. 83, 84].

Гродзенская экспедыцыя завяршыла раскопкі даваенных гадоў. Раскопачная плошча была абмежавана той жа прасторай, над якой яшчэ захоўвалася даўнейшае перакрыццё 1937 г. [6, с. 85]. Па дагаворы ад 2 чэрвеня 1949 г. паміж ГДГАМ і Рэспубліканскай навукова-вытворчай майстэрняй і згодна нараду-заказу на дадатковыя працы ад 7 верасня 1949 г. рэстаўрацыйнай экспедыцыяй былі выкананы наступныя працы. У спецыяльных рамах, выробленых музеем, зманціравалі асобныя фрагменты Ніжняй царквы. Пасля вайны, нягледзячы на ранейшую кансервацыю, гэтыя фрагменты знаходзіліся ў разбураным стане. Рэстаўратары зманціравалі пяць найбольш захаваных і буйных: арку партала; фрагмент сцяны з пачаткамі архівольтаў, з рэшткамі галаснікоў і іх гнёздаў на ўнутраным фасадзе, з маёлікавымі аздабленнямі на вонкавым фасадзе; фрагмент сцяны з устаўкай круглага блюда; фрагмент сцяны з трыма маёлікавымі пліткамі; два фрагменты сцяны з маёлікавымі пліткамі. Усе рэканструкцыі мелі сляды кансервацыі 1930-х гг., цэментны раствор знаходзіўся ў большай частцы швоў. Таму І. В. Трафімаў лічыў іх аўтэнтычнасць умоўнай. Мантаж быў паўторна выкананы на цэментным растворы. У фрагмент аркі партала і ў фрагмент сцяны з маёлікавымі крыжамі была ўведзена жалезная арматура. Пад нахіленыя і выпучаныя рэшткі сцяны вуглавой заходняй вежы замкавай сцяны таксама была падведзена бетонная армiраваная падэшва [10, л. 1; 11]. Такім чынам, адбыўся этап тэрміновай выратавальнай кансервацыі і рэстаўрацыі аб'ектаў архітэктурнай археалогіі.

У лістападзе 1949 г. над Ніжняй царквой узвялі драўляны павільён і адразу пачалося экскурсійнае наведванне аб'екта [12, л. 23]. У 1951 г. завершылася кансервацыя гэтай царквы, яна стала музейным аб'ектам. Што датычыцца Верхняй царквы, ад якой захаваліся частка апсіды і фрагменты сцен, то з міжваеннага часу яе аб'ёмы пакоіліся ў дашчатым сховішчы каля заходняга фасада палаца. Гэта не задавальняла ні музей, ні даследчыкаў, якія звярнулі ўвагу ў верасні 1949 г. на тое, што фрагменты Верхняй царквы змешчаны «ў драўляным сараі і выключаны з музейнага паказу» [9]. Камісія ў складзе дырэктара музея М. І. Собаля, археолага М. М. Вароніна і архітэктара І. В. Трафімава выказалася за неабходнасць паставіць у план работы музея на 1950 г. мерапрыемствы па зборцы фрагментаў царквы і будаўніцтву над помнікам адкрытага, архітэктурна прадуманага навесу. Музею трэба было прадугледзець адпаведныя асігнаванні [13, л. 5]. У адным з пісем да дырэктара музея М. М. Варонін яшчэ раз вяртаўся да тэмы

гродзенскіх помнікаў: «Организация такого музея будет иметь огромное научно-познавательное значение и политическую актуальность – документируя глубокую древность русской культуры на берегах Немана и древние связи русского и литовского народов. … В связи с этой работой нужно осуществить и сборку Верхней церкви и органически связать этот редчайший памятник с экспозицией Музея памятников русского Гродно» [14, л. 1].

У структуры ГДГАМ адбыліся змены, неабходныя для дакументіравання і прэзентацыі музеефіцыраваных помнікаў археалогіі. Не пазней 1950 г. у ГДГАМ быў створаны сектар археалогіі. Яго першай загадчыцай стала выпускніца Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта М. Е. Арсакава, затым на кароткі час – Д. Г. Магерамлі [15, л. 32–33; 16, л. 28]. Тэмамі навукова-даследчай работы музейных археолагаў у 1949 г. былі: «Неалітычная культура на тэрыторыі Заходняй Беларусі» (М. Е. Арсакава) і «Рускае Гродна XI–XII стст. па археалагічных матэрыялах» (Л. В. Аляксееў). Навуковыя рапрацоўкі служылі асновай стварэння стацыянарнай экспазіцыі. Супрацоўнікі сектара забяспечылі перадачу ў фонды музея ўсёй калекцыі з раскопак М. М. Вароніна колькасцю 4717 адзінак захоўвання.

Прыкладзеныя арганізацыйныя высілкі музея, прафесіяналізм археолагаў і архітэктараў, нялёгкая праца музейшчыкаў далі добры вынік. Адбыліся рэстаўрацыя і кансервацыя Ніжняй царквы in situ, па метадзе «каўпака». Да 2000-х гг. помнік захоўваўся без сурёзных натуральных разбурэнняў. Музейныя экскурсіі і заняткі для школьнікаў, лекцыі для студэнтаў каля мураваных сцен амаль 900-гадовага ўзросту, заўжды карысталіся папулярнасцю. У 1949 г. у дачыненні Ніжняй царквы вынікі рэстаўрацыі аказаліся вельмі станоўчымі. У той жа час Верхняя царква канца XIII – пачатку XIV ст., рэшткі так званага княжацкага церама XII ст. і замкавых казематаў XVII ст. былі пакінуты па-за межамі музеефікацыі.

*Заключэнне.* На прыкладзе дзейнасці ГДГАМ у другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг. мы можам прасачыць, як нараджалася новая з‘ява культуры – музеефікацыя помнікаў археалогіі. Гэта адбывалася пад уздзеяннем развіцця музейнай справы і археалагічнай навукі у час фарміравання музейнай сеткі рэспублікі. Асноўнымі складнікамі музеефікацыі помніка археалогіі (або групы помнікаў) з’яўляюцца: 1) ідэнтыфікацыя, фармулёўка ідэі захавання і выкарыстання; 2) археалагічныя даследаванні і вызначэнне каштоўнасці помніка, унікальнасці; 3) кансервацыя і рэстаўрацыя; 4) узвядзенне павільёна і прэзентацыя музейнымі сродкамі. Галоўнымі прынцыпамі ажыццяўлення музеефікацыі, якія былі агучаны спецыялітамі на прыканцы 1940-х гг., сталі прынцып прыярытэту захаванасці аўтэнтычных частак над рэканструкцыямі, прыярытэту навуковасці, а таксама прынцып функцыянальнасці, калі прадугледжваліся розныя спосабы знаёмства з помнікам, стваралася магчымасць з цягам часу ўносіць змены ў форму ахоўнага павільёна над помнікам. У ходзе музеефікацыі былі выкарыстаны метады «кансервацыі» і «каўпака» у распрацаваным раскопе in situ.

*Літаратура і крыніцы*


1. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГр). – Ф. 1269. Воп. 1. Спр. 1. Л. 1–60.
2. О создании археологического музея в Гродно : письмо И. И. Василевича председателю Комитета по делам культурно-просветительных учреждений при СНК БССР, 11 сент. 1945 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 790. Воп. 1. Спр. 3. Л. 23–27.
3. Архіў УК ГДГАМ (кадры). – Спр. 1. Л. 1–35.
4. *Воронин, Н. Н.* Древнее Гродно / Н. Н. Воронин // Сов. археология / Акад. наук СССР, Ин-т истории матер. культуры ; редкол.: Б. А. Рыбаков (отв. ред.) [и др.]. – М., 1954. – Т. 19. – С. 41–76.
5. Положение о Гродненском государственном историко-археологическом музее, 15 янв. 1946 г. // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 1269. Воп. 1. Спр. 1. Л. 3–5.


*References*


1. Dzyarzhauny arhiu Grodzenskaj voblasci (DAGr). – F. 1269. Vop. 1. Spr. 1. L. 1–60.
2. O sozdanii arheologicheskogo muzeya v Grodno : pis’mo I. I. Vasilevicha predsedatelyu Komiteta po delam kul’turno-prosvetitel’nyh uchrezhdenij pri SNK BSSR, 11 sent. 1945 g. // Nacyyanal’ny arhiў Respubliki Belarus’ (NARB). – F. 790. Vop. 1. Spr. 3. L. 23–27.
3. Arhiў UK GDGAM (kadry). – Spr. 1. L. 1–35.
4. *Voronin, N. N.* Drevnee Grodno / N. N. Voronin // Sov. arheologiya / Akad. nauk SSSR, In-t istorii mater. kul’tury ; redkol.: B. A. Rybakov (otv. red.) [i dr.]. – M., 1954. – T. 19. – S. 41–76.
5. Polozhenie o Grodnenskom gosudarstvennom istoriko-arheologicheskom muzee, 15 yanv. 1946 g. // Dzyarzhaўny arhiў Grodzenskaj voblasci (DAGV). – F. 1269. Vop. 1. Spr. 1. L. 3–5.

6. *Воронин Н. Н.* Отчет Гродненской экспедиции 1949 г. ИИМК и ГГИАМ / Н. Н. Воронин // ГДГАМ. – Асн. фонд. КП-16178. – 88 с.
7. Акт о состоянии археологических материалов из раскопок 1937–1939 гг. на Старом замке в Гродно, составленный Н. И. Соболем, Н. Н. Ворониным, В. В. Седовым, 16 авг. 1949 г. // ГДГАМ. – Асн. фонд. КП 89650. Л. 1–2.
8. Акт по учету археологических материалов из раскопок 1937–1939 гг. на Замковой горе в Гродно, составленный Н. И. Соболем, Н. Н. Ворониным, Л. Б. Артишевской, 5 окт. 1949 г. // ГДГАМ. – Асн. фонд. КП 89659. Л. 1–2.
9. Акт выполненных работ Республиканской мастерской по реставрации и восстановлению памятников архитектуры от 13.09.1949 г. // Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей (ГДГАМ). – Асноўны фонд. КП-89652. –1 ЛЛ.
10. Заключение И. В. Трофимова от 13.09.1949 г. // ГДГАМ. – Асн. фонд. КП-89652. Л. 1.
11. Заключение И. В. Трофимова от 14.09.1949 г. // ГДГАМ. – Асн. фонд. КП-89649/1. Л. 1–3.
12. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГр). – Ф. 1269. Воп. 1. Спр. 45. Л. 23.
13. Акт от 03.09.1949 г., составленный Н. И. Соболем, Н. Н. Ворониным, И. В. Трофимовым // ГДГАМ. – Асн. фонд.КП-89653. – 5 ЛЛ.
14. Пісьмо М. М. Вароніна да М. І. Собаля ад 11.10.1949 г. // ГДГАМ. – Асн. фонд. КП-89660. Л. 1.
15. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГр). – Ф. 1269. Воп. 1. Спр. 19. Л. 9–45.
16. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГр). – Ф. 1269. Воп. 1. Спр. 36. Л. 5–38.

6. *Voronin N. N.* Otchet Grodnenskoj ekspedicii 1949 g. IIMK i GGIAM / N. N. Voronin // GDGAM. – Asn. fond. KP-16178. – 88 s.
7. Akt o sostoyanii arheologicheskih materialov iz raskopok 1937–1939 gg. na Starom zamke v Grodno, sostavlennyj N. I. Sobolem, N. N. Voroninym, V. V. Sedovym, 16 avg. 1949 g. // GDGAM. – Asn. fond. KP 89650. L. 1–2.
8. Akt po uchetu arheologicheskih materialov iz raskopok 1937–1939 gg. na Zamkovoj gore v Grodno, sostavlennyj N. I. Sobolem, N. N. Voroninym, L. B. Artishevskoj, 5 okt. 1949 g. // GDGAM. – Asn. fond. KP 89659. L. 1–2.
9. Akt vypolnennyh rabot Respublikanskoj masterskoj po restavracii i vosstanovleniyu pamyatnikov arhitektury ot 13.09.1949 g. // Grodzenski dzyarzhaўny gistoryka-arhealagichny muzej (GDGAM). – Asnoўny fond. KP-89652. –1 LL.
10. *Zaklyuchenie I. V.* Trofimova ot 13.09.1949 g. // GDGAM. – Asn. fond. KP-89652. L. 1.
11. *Zaklyuchenie I. V.* Trofimova ot 14.09.1949 g. // GDGAM. – Asn. fond. KP-89649/1. L. 1–3.
12. Dzyarzhaўny arhiў Grodzenskaj voblasci (DAGr). – F. 1269. Vop. 1. Spr. 45. L. 23.
13. Akt ot 03.09.1949 g., sostavlennyj N. I. Cobolem, N. N. Voroninym, I. V. Trofimovym // GDGAM. – Asn. fond.KP-89653. – 5 LL.
14. *Pis'mo M. M.* Varonina da M. I. Sobalya ad 11.10.1949 g. // GDGAM. – Asn. fond. KP-89660. L. 1.
15. Dzyarzhaўny arhiў Grodzenskaj voblasci (DAGr). – F. 1269. Vop. 1. Spr. 19. L. 9–45.
16. Dzyarzhaўny arhiў Grodzenskaj voblasci (DAGr). – F. 1269. Vop. 1. Spr. 36. L. 5–38.